**Тэма: «Абагульненне і сістэматызацыя вывучанага па тэме «Прыметнік»**

**Мэты:**
- садзейнічаць сістэматызацыі і абагульненню ведаў па тэме "Прыметнік";
- спрыяць удасканальванню навыкаў правапісу канчаткаў прыметнікаў у пачатковай і іншых склонавых формах,групаваць прыметнікі па сэнсавых і граматычных прыметах,правільна ставіць пытанні да прыметнікаў,вызначаць род, лік, склон, дапасоўваць да назоўнікаў;
- садзейнічаць выхаванню павагі да роднай мовы

**Тып:** урок – абагульненне.

**Абсталяванне:** падручнік па беларускай мове для 6 класа; бланкі рознаўзроўневых заданняў.

**Ход урока:**

**1. Арганізацыйна – матывацыйны этап.**

- Добры дзень. Сядайце, калі ласка. Мы пачынаем наш урок. З якім настроем вы сёння прыйшлі на ўрок? Выберыце той колер, які адпавядае вашаму настрою на пачатку ўрока. (Метад стварэння спрыяльнай атмасферы, арганізацыі камунікацыі)

Мы закончылі вывучэнне тэмы "Прыметнік". Можа, каму – небудзь з вас яна здалася цяжкай, але ж ведаць, як правільна ўжываць прыметнікі ў мове, трэба кожнаму. Давайце вызначым задачы нашага ўрока.

На дошцы напісана: **Будзе паўтараць…**
**Будзем ведаць…**
**Будзем умець…**

**2. Праверка дамашняга задання.**

- Якое было дамашняе заданне? (Трэба было з верша Дануты Бічэль выпісаць прыметнікі, вызначыць іх сэнсавы разрад, зрабіць марфалагічны разбор прыметніка беларускае (слова).

- Давайце спачатку паслухаем гэты верш.

(Вучаніца чытае верш на памяць)

Я чула пяшчотнае, шчырасці поўнае,
Маё беларускае, роднае, кроўнае,
Такое раптоўнае, такое чароўнае,
Такое ласкавае, цёплае, чыстае,
Як сонца, агністае, як Нёман, празрыстае,

Як казка, быліна, як песня, жаданае,
Дагэтуль яшчэ ў жыцці неспазнанае,
Гарачае слова ад шчырага сэрца.

Настаўнік: Чаму менавіта гэтыя словы я ўзяла ў якасці эпіграфа? (таму што ў гэтым вершы многа прыметнікаў).

- Прачытайце прыметнікі, якія вы выпісалі з верша.
- Якая асноўная думка, выказаная Д.Бічэль у гэтых радках?

**3. Індывідуальныя заданні 5 с.148,В-1; практ.107 с.64 рабочага сшытка.**
**1) Актуалізацыя ведаў.**
- Састаўце пашпарт прыметніка.
**1.** Прыметнік – гэта…
**2.** Якая абазначае…
**3.** Адказвае на пытанні…
**4.** Пачатковай формай з'яўляецца…
**5.** Марфалагічныя прыметы…
**6.** Залежаць ад…
**7.** У сказе часцей за ўсё з'яўляецца…, а можа быць…
**2) Казачны аповед (апераджальнае заданне).**
- У цудоўнай краіне Марфалогіі жылі-былі два хлопчыкі. Былі яны розныя, але мелі шмат падобнага. Пачне, напрыклад, адзін з іх бегаць па склонах (прабачце, па схілах), і другі гэтак жа робіць. Адзін змяняецца па ліках, і другі тое самае робіць. Род у кожнага з іх быў вялікі: мужчынскі, жаночы і ніякі. І вельмі ж дапытлівымі былі хлопчыкі. Чаму хлопчыкі былі дапытлівыя? (Таму што любілі задаваць пытанні: хто? што?, які? чый?)
Што ж гэта за 2 хлопчыкі, якія так спрытна бегалі па Марфалогіі? У каго з іх быў свой род, хто бегаў па склонах, ліках першы, а хто набываў граматычныя катэгорыі свайго брата?) (1 – назоўнік, 2 – прыметнік).
Вывад: род, лік, склон прыметніка залежаць ад назоўніка.
**Заданне:**
1. Перакласці на беларускую мову словазлучэнні і запісаць у сшытак, вызначыць род назоўнікаў, выпісаць адносныя прыметнікі.
Двухлетний гусь, глиняная посуда, угольная пыль, злая собака, красный пион,народный судья, белая ромашка,короткая запись, золотая медаль, большая щука,деревянный шкаф.
**3) Практыкаванне 2, с. 148., практыкаванне 7, с.149, практыкаванне 8, с. 149.**

**Фізкультхвілінка.**

**4) Пытанні з кошыка** ( бледна-ружовая кветка, пяціразовае харчаванне, нью-ёркскі квартал, тонкагалосы спявак, паўночна-ўсходні вецер, Усходне-Еўрапейская раўніна, паўднёвакарэйскі самалёт). Перакладзі на беларускую

мову. Днепр длиннее Припяти. Мой брат выше и сильнее меня. Мальчишка был двумя годами старше Саши и сильнее его.
Як быў маладзей за яе. (выглядаў).
На дошцы!!! Узнавіць ланцужок утварэння.
Унук для Людмілы быў самым найдаражэйшым чалавекам.
**5) На дошцы** адлюстраваць утварэнне прыметніка пяціразовае харчаванне.
**6) Міні-тэст**
1.Прыметнік – гэта часціна мовы, якая абазначае:
а)Прадмет; б)прымету; в)дзеянне.
2. Марфалагічныя прыметы прыметніка :
а)лік; б) склон; в) род; г) скланенне.
3. Знайдзіце радок, у якім знаходзяцца толькі прыметнікі:
а)павольны, разумнае, зеляніна, бялець;
б)павольны, разумнае, зялёны, белы;
в)павольны,розум,зялёны,белы;
г)павольны,белы, разумны, бель.
4. Вызначце склон, род і лік выдзеленага слова ў сказе:
За вёскай, на **старой** бярозе, здаўна вяліся буслы.
а)Р.скл.,м.р.,адз.л.; б)М.скл.,м.р.,адз.л.; в)Т.скл.,м.р.,адз.л.
5. Вызначце, якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае слова ў сказе:
Ад нас залежыць, якой мы пакінем прыроду наступным пакаленням.
а) азначэнне; б) акалічнасць; в) выказнік.
Ключы да тэста: 1-а; 2-а,б,в; 3-б; 4-б; 5-а.
**7) Праца з тэкстам.**
Слова настаўніка:
- Зямля пад белымі крыламі…Так прыгожа назваў паэт нашу краіну, родную старонку Беларусь. І сапраўды, дзе яшчэ над блакітнымі стужкамі рэк і рачушак у ясным небе лунае такая колькасць белакрылых буслоў.

---

Па __________ траве паважна і мауклiва ходiць бусел. У яго ____________ i __________дюба____________ колеру, _____________ногi таксама _____________.Сам ен _________. ___________ толькi канцы __________ i ___________крылау. Бусел ня мае голасу. Ён некрычыць, а клекоча- гучна i часта щоўкае дюбай. Гняздiцца бусел недалёка ат чалавека. Кожную вясну вяртаецца на свае старое месца, де знаходiцца яго_________.(назоўнiк) Гняздо у бусла велiкае. Яно складена з ___________.(назоўнiк) Кожны гот буслы дабудоуваюць сваё жытло i буслянка робiцца усё вялiкай i высокай (утварыць простую форму вышэйшай ступені параўнання).Унутры яна выслана травой саломай перем. В апреле (перакласці) буслiха аткладвае некалькi яек. Малые буслянята зяўляюцца у мае а восеню разам с бацкамi атлятають ў вырай.

Заданні да тэксту:
1. Выпраўце ўсе памылкі ручкай, растлумачце правапіс.

2. Вызначце стыль,тып тэксту,тэму.Дайце назву тэксту,падзяліце на сэнсавыя часткі.
3. Якую ролю ў мове адыгрываюць прыметнікі? (яны дакладна, ярка і вобразна апісваюць прадмет (апісальная роля), выдзяляюць прадмет з шэрага іншых (выдзяляльная роля), даюць ацэнку таму ці іншаму прадмету (ацэначная роля).Выпішыце словазлучэнні з такімі прыметнікамі,абазначце суфіксы.
4.Размяркуйце прыметнікі па разрадах па значэнні.
5.Утварыце ступені параўнання ад прыметніка вялікі і высокі. 6. Зрабіць сінтаксічны разбор апошняга сказа.

Слова настаўніка**:**

- Усе мы, хто жыве на беларускай зямлі, шчаслівыя людзі. Шчаслівыя таму, што можам любавацца сінімі азёрамі, зялёнымі лясамі, шчодрымі на ўраджай жытнёвымі палямі, дыхаць духмяным водарам бароў, дрэў і кветак.

Але ці ўмеем мы берагчы гэтую прыгажосць, захоўваць чысціню сваіх родных мясцін, ці здольны пакінуць пасля сябе след чалавека, а не жорсткага варвара?

Напэўна, не заўсёды!

**Фізкультхвілінка (метад «Алітэрацыя імя»).**

- Дайце характарыстыку самому сабе з дапамогай прыметніка. Характарыстыка павінна пачынацца з той жа літары, што і імя.

**8) Крыжаванка.**

Устаўце прапушчаныя прыметнікі (у адзіночным ліку, мужчынскім родзе) ва ўстойлівыя параўнанні.

| Па гарызанталі | |
|---|---|
| 2. ..., як мёд | Па вертыкалі |
| 5. ..., як брытва | 1. ..., як дуб |
| 7. ..., як пушынка | 3. ..., як ноч |
| 8. ..., як голуб | 4. ..., як папера |
| 9. ..., як камень | 6. ..., як ліс |
| 11. ..., як струна | 10. ..., як варона |
| 12. ..., як свет | |

**9) Падвядзенне вынікаў урока. Выстаўленне адзнак.**
**10) Рэфлексія. Прыём "Незакончаны сказ":**
- Сёння на ўроку я зразумеў…
- Я навучыўся…
- Было не зразумела…
- Было цікава…
- Які настрой у канцы ўрока?

**11) Дамашняе заданне: Міні-сачыненне «Прырода-наш агульны дом».**






Классный уголок